Г. Шредера. В итоге правительство ФРГ и Франции совместно выступили с отказом поддержать военную операцию США в Ираке. Вместе с тем немецкое руководство выступало за решение проблемы дипломатическим путем, а также изъявило желание принять участие в мирном урегулировании кризиса [4].

Таким образом, можно отметить, что курс ФРГ на приверженность к Североатлантическому альянсу не изменился со времен «холодной войны». Германия выступает в качестве активного игрока, предлагая различные инициативы по развитию организации, а также участвуя в военных операциях. Стоит отметить и тот факт, что это одно из государств, которое щедро финансирует данную структуру. Несмотря на разногласия, которые имели место во взаимоотношениях между США и ФРГ в начале 2000-х гг., членство и участие в НАТО было и остается приоритетным и важным направлением во внешнеполитическом курсе страны.

**Литература**

1. Антюхова, Е. А. Германская внешняя политика и трансформация стратегии НАТО в конце XX – начале XXI в. / Е. А. Антюхова // Весник Брянского государственного университета [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/germanskaya-vneshnyaya-politika-i-transformatsiya-strategii-nato-v-kontse-xx-nachale-xxi-vv. – Дата доступа: 08.04.2022.

2. Шарапо, А. В. Политические системы и внешняя политика Германии, Австрии, Швейцарии : учеб. пособие / А. В. Шарапо. – Минск : БГУ, 2007. – 231 с.

3. Павлов, Н. В. История внешней политики Германии: от Бисмарка до Меркель : учеб. пособие / Н. В. Павлов. – М. : Международные отношения, 2012. – 797 с.

4. Трунов, Ф. О. Германия и иракский военно-политический кризис 2003 г. [Электронный ресурс] / Ф. О. Трунов // Современная Европа. – 2015. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/germaniya-i-irakskiy-voenno-politicheskiy-krizis-2003. – Дата доступа: 11.04.2022.

# Сімвалізм у знешнім выглядзе шляхты ў канцы XVIII – пач. XIX ст.

*Пухцеева Л. С., студ. IV к. БДУ,*
*навук. кір. Макарэвіч В. С., канд. гіст. навук, дац.*

З дапамогай знешняга выгляду чалавек выказвае свае інтарэсы, адносіць сябе да той ці іншай групы людзей. Знешнасць чалавека служыць своеасаблівым адлюстраваннем яго ментальнасці. Можна цалкам пагадзіцца

з І. Красіцкім, які пісаў: «Строй не робіць мужа, але ён часта паказвае, што адбываецца ўнутры чалавека» [6, с. 170].

Перад пагрозай страты дзяржаўнасці ў канцы XVIII ст. сярод шляхты Рэчы Паспалітай назіраецца паварот да сармацкага традыцыяналізму ў адзенні, вяртанне да кунтуша, які цяпер выступае як сімвал патрыятызму, а таксама як гарант адасобленасці шляхецкага народа. Узнікае канфлікт паміж «фракамі» і «кунтушамі», якія выражаюць не толькі модныя тэндэнцыі ў тагачасным грамадстве, але таксама пытанні роднага і іншаземнага, традыцый і навізны, адасобленасці і ўніфікацыі.

Напярэдадні Чатырохгадовага сойма і падчас яго правядзення нацыянальны строй часта выкарыстоўваўся як сродак палітычнай прапаганды. Людзі сталі пратэставаць супраць замежнай моды і заклікаць да сармацкага касцюма як знешняга выразу ідэнтычнасці шляхецкай нацыі. Напрыклад, сям'я Чартарыйскіх, якая ў часы Сасаў адной з першых адмовілася ад кунтушаў, дэманстратыўна вярнулася да нашэння шляхецкай вопраткі. Так, у студзені 1788 г. Ізабэла Чартарыйская пісала свайму сыну Адаму, каб ён вярнуўся з-за мяжы ў польскім строі. У прыватнасці, яна піша: «…ты настроіш людзей супраць сябе, калі вернешся ў французскім строі; у польскім строі ты здабудзеш сяброў з правінцыі» [6, с. 166].

У гэты час канчаткова аформілася патрыятычная сімволіка з такімі элементамі, як кунтуш, пояс і вусы, і «здрадніцкая» сімволіка, звязаная з фракам, парыком і паголеным тварам – «хто ў польскім строі ходзіць, мае сэрца паляка, а хто ў кусым – подлыя думкі». Такім чынам, кунтушовыя дэпутаты – прыхільнікі Канстытуцыі 3 мая, а фракавыя – тыя дэпутаты, якія не праяўляюць ніякай актыўнасці ў сойме, праціўнікі рэформ, здраднікі радзімы [6, с. 168].

У сваіх мемуарах К. Казьмян пісаў: «У кунтушы падкаморы Красінскі ўзняў і ўзначаліў Барскую канфедэрацыю, у кунтушы Пулаўскі бараніў рэлігію і айчыну, у кунтушы ўсклікнуў дабрадзейны Рэйтан, лежучы на соймавым парозе: "Забіце мяне, але не забівайце айчыну!", у кунтушы паўтараў на сойме 1788 г. Корсак : "Скарб і войска!", а фракавы Панінскі забіў і чвартаваў Польшчу, фракавыя магнаты ўзнялі паўстанне ў Таргавіцы, фракавыя Мячынскі і Падгорскі вынеслі на Гарадзенскім сойме праект падзелу і фракавы кароль Станіслаў Аўгуст яго падпісаў» [4, с. 139].

Замежная вопратка асацыявалася з чымсьці чужым і, адпаведна, негатыўным. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў народнай традыцыі, дзе існаваў вобраз чорта ў іншаземным адзенні [3]. Вобраз д'ябла, які выглядаў як іншаземец (апранаў чырвоны ці чорны фрак), стаў асабліва папулярным падчас падзелаў Рэчы Паспалітай [2]. Так, напрыклад, у «Пані Твардоўскай» А. Міцкевіча чорт паказваецца ў нямецкім кусым строі [5, с. 16].

Менавіта з пранікненнем іншаземшчыны многія звязвалі крах Рэчы Паспалітай. К. Казьмян пісаў, што страта дзяржаўнасці была выклікана

прыходам новай моды, якая прынесла чуму раскошы, распусты і спешчанасці [4, с. 137–138]. У паэме «Пан Тадэвуш» пан Падкаморы французскую моду называе Божай карай і атрутай, якая прымушала людзей мяняць мову, веру, звычаі, уборы. Прычым ні да чаго добрага пагоня за модай не прывяла, паколькі на змену гэтаму маскараду прыйшла няволя [1].

Новыя сацыяльна-палітычныя ўмовы, з якімі сутыкнулася прывілеяванае саслоўе былой Рэчы Паспалітай пасля ўваходжання яе зямель у склад Расійскай імперыі, а таксама ўмовы, калі праходзіў разбор шляхты, выклікалі ў прадстаўнікоў набілітэту вострую патрэбу ў падкрэсленні свайго статусу. Па гэтай прычыне некаторыя прадстаўнікі беларускай шляхты працягвалі хадзіць у старапольскім строі, праўда, рабілі гэта ў асноўным па святах або ў сувязі з нейкімі ўрачыстасцямі.

Такім чынам, у разглядаемы перыяд знешні выгляд выконваў важную сімвалічную функцыю – згуртаваць прывілеяванае саслоўе перад тварам небяспекі страты дзяржаўнасці, забяспечыць адасобленасць шляхецкага народу Рэчы Паспалітай ва ўмовах уніфікацыі.

**Літаратура**


1. Міцкевіч, А. Пан Тадэвуш [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://knihi.com/Adam_Mickievic/Pan_Tadevus_Bitel.html#chapter1. – Дата доступу: 18.08.2021.
2. Bazylak, P. Diabeł – kulturowy obraz na tle historii [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://epage.pub/doc/piotr-bazylak-diabe-kulturowy-obraz-na-tle-historii-wk7l44pxpq. – Дата доступу: 18.08.2021.
3. Głażewska, E. Inny/obcy jako uosobienie diabła [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.kulturaihistoria.umcs.lublin.pl/wp-content/uploads/2018/05/Kultura-i-Historia-nr-32-2017-99-111.pdf. – Дата доступу: 18.08.2021.
4. Koźmian, K. Pamiętniki Kajetana Koźmiana obejmujące wspomnienia od roku 1780 do roku 1815 / K. Koźmian. – Poznań : Nakładem Konstantego Żupańskiego, 1858. – 345 s.
5. Mickiewicz, A. Pani Twardowska: tekst i podobizna autografu / A. Mickiewicz. – Kraków : Towarzystwo Miłośników Książki, 1928. – 20 s.
6. Roćko, A. Kontusz i frak jako symbole osiemnastowiecznych Sarmatów. Zarys problematyki, [w:] W stronę Francji… Z problemów literatury i kultury polskiego Oświecenia, pod red. E. Z. Wichrowskiej. – Warszawa, 2007. – S. 156–172.